УДК 94(476) 1921/1939

# ЛЕГАЛЬНЫЯ ФОРМЫ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БЕЛАРУСКІМ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ РУХУ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

***Аляксандр Горны***
*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Гродна, Беларусь*
litvin_horny@tut.by

У міжваенны перыяд у Заходняй Беларусі дзейнічала тры плыні беларускага нацыянальнага руху – левaрадыкальная, нацыянальна-дэмакратычная і паланафільская, прадстаўнікі якіх выкарыстоўвалі як легальныя, так і нелегальныя формы палітычнай дзейнасці. У артыкуле вылучаюцца формы легальнай работы беларускага руху, напрыклад, удзел беларусаў у выбарчых кампаніях, распаўсюджванне легальнай літаратуры ці правядзенне мемарыяльных мерапрыемстваў. Аўтар артыкула прыходзіць да высновы, што наяўнасць розных форм легальнай дзейнасці значна пашырада беларускую нацыянальную свядомасць, але ў 1930-я гады польскія ўлады звузілі гэтую сферу да мінімума.

***Ключавыя словы: беларускі нацыянальны рух, Заходняя Беларусь, міжваенная Польшча, легальная дзейнасць, нацыянальнае пытанне***

# LEGAL FORMS OF ACTIVITY IN THE BELARUSIAN NATIONAL MOVEMENT IN INTERWAR WESTERN BELARUS

***Aliaksandr S. Gorny***

*Yanka Kupala State University of Grodno, Grodno, Belarus*

There were three currents of the Belarusian national movement - the left, the national-democratic and the polonophilic in the interwar period in Western Belarus. Their representatives used both legal and illegal forms of political activity. The article indicates such forms of legal work of the Belarusian movement: participation of Belarusians in election campaigns, distribution of legal literature or participation in memorial events. The author concludes that the existence of various forms of legal activity expanded the Belarusian national identity, but in the 1930s the Polish authorities canceled it out.

***Keywords: Belarusian national movement, Western Belarus, interwar Poland, legal activity, national question***

У міжваеннае дваццацігоддзе ў Заходняй Беларусі ў межах беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, які ставіў перад сабой задачу барацьбы за аб’яднанне беларускіх земляў і стварэнне беларускай дзяржаўнасці, вылучыліся тры палітычныя плыні: нацыянальна-дэмакратычная, паланафільская і леварадыкальная. Арганізацыі нацыянальна-дэмакратычнай плыні (Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), Беларускі сялянскі саюз (БСС), Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК), група В. Гадлеўскага “Беларускі фронт” і інш.) дамагаліся аб’яднання беларускіх земляў і стварэння незалежнай беларускай дзяржавы з рэспубліканскай формай кіравання. Беларускія паланафілы выступалі за супрацоўніцтва з інстытутамі польскай дзяржавы дзеля дасягнення нацыянальна-культурных і палітычных саступак для беларускага народа (Часовая беларуская рад (ЧБР), Беларуская радыкальная народная партыя (БРНП), таварыства “Прасвета”, група Луцкевіча-Астроўскага і інш.). Левaрадыкальная плынь была прадстаўлена прыхільнікамі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ) і Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПСР), якія імкнуліся да змены існуючага грамадскага і палітычнага ладу Заходняй Беларусі радыкальнымі, ці рэвалюцыйнымі сродкамі [1, с. 6–7]. Дзве першыя плыні ажыццяўлялі сваю дзейнасць легальнымі формамі ў рамках польскага заканадаўства, прадстаўнікі левaрадыкальнай плыні спрабавалі сумяшчаць легальныя і нелегальныя формы дзейнасці, аддаючы перавагу ў асноўным, апошнім. На сённяшні час у айчыннай гістарыяграфіі праблема суадносін легальных і нелегальных форм барацьбы беларускіх структур у міжваеннай Заходняй Беларусі не была прадметам асобнага даследавання, што стварае падставы звярнуць больш пільную ўвагу на кожную з гэтых форм.

Значнай прэрагатывай у беларускіх актывістаў карысталіся легальныя формы дзейнасці, якія дазвалялі ахопліваць шырокую аўдыторыю для пашырэння нацыянальнай свядомасці і правядзення беларускай агітацыі ў рамках існуючага польскага заканадаўства. Сярод іх найбольш запатрабаванымі і распаўсюджанымі ў беларускім руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі былі наступныя:

1. Удзел прадстаўнікоў беларускага руху ў выбарчых кампаніях у парламент і органы мясцовага самакіравання;
2. Арганізацыя і правядзенне мітынгаў, сходаў;
3. Распаўсюджванне легальнай літаратуры і перыядычнага друку;
4. Правядзенне мемарыяльных мерапрыемстваў.

Адной з самых асноўных формаў легальнай дзейнасці беларускага руху ў Заходняй Беларусі, якая гарантавалася дзяржаўным заканадаўствам Польшчы, быў удзел беларускіх актывістаў у парламенцкіх выбарах ці выбарах у органы мясцовага самакіравання. Беларусы актыўна ўдзельнічалі ў парламенцкіх выбарчых кампаніях 1922, 1928 і 1930 гг., самаўрадавых выбарчых кампаніях 1927 і 1929 гг. Дадзеныя кампаніі садзейнічалі актывізацыі беларускага грамадска-палітычнага жыцця ў розных рэгіёнах Заходняй Беларусі, уцягненню ў беларускі рух новых актывістаў і пашырэнню нацыянальнай самасвядомасці [2, с. 101].

Значную ўвагу неабходна звярнуць на выбарчую кампанію 1922 г. – фактычна першую масавую палітычную кампанію, з якой прыйшлося сутыкнуцца беларускаму насельніцтву Заходняй Беларусі пасля Рыжскага міру. У жніўні 1922 г. у Вільні быў створаны Беларускі цэнтральны выбарчы камітэт, які неўзабаве прыняў рашэнне аб’яднацца з украінскімі, рускімі, нямецкімі і яўрэйскімі структурамі Польшчы ў Блок нацыянальных меншасцяў. У гарадах і вёсках Заходняй Беларусі пачалі стварацца мясцовыя выбарчыя камітэты, якія атрымлівалі з Вільні неабходныя агітацыйныя матэрыялы. Менавіта шчыльны кантакт правінцыйнай інтэлігенцыі і сялян з Беларускім цэнтральным выбарчым камітэтам пашыраў сярод іх беларускую ідэнтычнасць і дазваляў масава рэкрутаваць у беларускі рух новых прыхільнікаў. Толькі ў Лідскай і Свянцянскай акругах восенню 1922 г. дзейнічала каля 115 беларускіх агітатараў, якія ў сваіх справаздачах падкрэслівалі ўсплеск нацыянальнай свядомасці мясцовага насельніцтва і яго падрыхтаванасць да арганізацыйных і легальных форм дзейнасці [3].

Сярод мясцовых агітатараў падчас выбарчай кампаніі 1922 г. перавагу мелі настаўнікі, вучні беларускіх гімназій альбо студэнты. Напрыклад, выкладчык Нясвіжскай беларускай гімназіі Язэп Шнаркевіч паралельна з’яўляўся кіраўніком мясцовага беларускага выбарчага камітэту і ў свабодны час пасля вучэбных заняткаў праводзіў агітацыю ў вёсках каля Нясвіжу [4]. Значна недаацэненым у айчыннай гістарыяграфіі

з'яўляецца ўдзел у агітацыйных мерапрыемствах у 1922 г. праваслаўнага духавенства. Іх аўтарытэт сярод большасці тагачасных беларускіх сялян быў вельмі моцным, а праваслаўны прыход з'яўляўся важным месцам сацыяльнай камунікацыі людзей у сельскіх умовах. Больш таго, палітыка паланізацыі і звужэння дзейнасці Праваслаўнай царквы давала магчымасць праваслаўным святарам звярнуць увагу на структуры беларускага нацыянальнага руху як на патэнцыйных саюзнікаў і абаронцаў. Таму ў дакументах сустракаюцца шмат сведчанняў аб правядзенні святарамі агітацыі на карысць Беларускага цэнтральнага выбарчага камітэта. Напрыклад, у Лідскім павеце актыўную дзейнасць у гэтым кірунку праводзіў святар Юстын Шчасны, у Вялейскім – святар Лапіцкі, у Баранавіцкім – святар Павел Мацкевіч [5, арк. 14, 16, 18]. Настаяцель прыхода ва Усялюбе Навагрудскага павета іерэй Іосіф Зубовіч заклікаў з царкоўнага амвона сваіх прыхаджан выбіраць беларускіх дэпутатаў у Сейм, бо яны "будуць імкнуцца вывесці Беларусь з-пад польскага іга і аб'яднаць з астатнімі беларускімі землямі" [6, арк. 552]. Без перабольшванняў, можна меркаваць, што ангажаванасць праваслаўнага духавенства ў выбарчую кампанію 1922 г. стала адным з вырашальных фактараў, які дапамог атрымаць беларускім структурам адносны поспех падчас выбараў: у заканадаўчыя палаты польскага парламента было абрана 11 дэпутатаў і 3 сенатара.

Калі ўдзел беларусаў у парламенцкіх выбарах міжваеннай Польшчы на сённяшні час дастаткова добра адлюстраваны ў гістарыяграфіі, то, напрыклад, выбары ў гмінныя і гарадскія рады 1927 г. з'яўляюцца маладаследаваным аспектам легальнай барацьбы беларусаў за свае палітычныя і сацыяльныя правы. У прыватнасці, толькі ў Віленскім ваяводстве падчас гэтых выбараў у гмінныя органы самакіравання прайшло каля 34% прадстаўнікоў розных беларускіх партый і арганізацый [7, s. 3]. У некаторых мясцовасцях Заходняй Беларусі, дзе перадвыбарчая агітацыя насіла сістэмны характар, колькасць беларускага насельніцтва ў органах самакіравання пасля выбараў была наўпрост падаўляючай. Напрыклад, у гмінную раду мястэчка Сіняўка Нясвіжскага павету было абрана 10 беларусаў, адзін паляк і адзін яўрэй [8, арк. 355]. На 1929 г. у працы Скідзельскай гміннай рады ўдзельнічала 9 беларусаў – былых прыхільнікаў Беларускай сялянска-работніцкай грамады [9, арк. 91]. Дадзены поспех на лакальным узроўні беларускія актывісты выкарыстоўвалі дзеля таго, каб легальна, праз органы самакіравання, дамагчыся адкрыцця беларускіх школ, эканамічнага паляпшэння для той ці іншай мясцовасці альбо фінансавання розных беларускіх ініцыятыў.

Вельмі запатрабаванай формай легальнай дзейнасці беларускага руху ў міжваенны перыяд былі мітынгі і палітычныя сходы, бо яны дазвалялі ажывіць палітычнае жыццё і нацыянальны дыскурс не толькі ў гарадах, але і ў сельскай мясцовасці. Гэтай формай актыўна карысталіся, напрыклад, беларускія дэпутаты польскага парламента, якія часта арганізоўвалі альбо справаздачныя мітынгі, альбо раптоўныя сходы дзеля вырашэння якой-небудзь праблемы. Напрыклад, беларускі сенатар польскага парламента В. Багдановіч 4 мая 1924 г. арганізаваў у мяст. Жыровічы мітынг з мэтай абароны праваслаўнага манастыра ад захопу з боку каталіцкага духавенства, на якім удзельнічала каля 300 чалавек [10]. Часта беларускія дэпутаты для правядзення сваіх мерапрыемстваў выбіралі дні кірмашоў ці рэлігійных фэстаў, каб сабраць у адным месцы як мага болей аўдыторыю. Дадзеная форма легальнай агітацыі была вельмі распаўсюджана ў 1920-я гг., калі ў польскім парламенце існавалі беларускія прадстаўніцтва, аднак у 1930-я гг. магчымасць правядзення легальнага мітынгу для беларускага руху практычна раўнялася нулю і таму ў гэты перыяд нярэдкай з'явай былі нелегальныя дэманстрацыі, арганізаваныя актывістамі КПЗБ [11, с. 153].

Мітынгі і сходы вельмі актыўна выкарыстоўвалі ў сваёй дзейнасці прадстаўнікі беларускіх паланафільскіх арганізацый. Маючы на правядзенне такіх мерапрыемстваў поўны дазвол польскіх уладаў, беларускія паланафілы з нагоды пэўных палітычных падзей у краіне ладзілі лакальныя мітынгі, каб замацаваць у мясцовага насельніцтва прыхільнасць да польскай дзяржаўнасці. У маі 1926 г., напрыклад, сябры Часовай беларускай рады правялі цэлы шэраг мітынгаў у мясцовасцях Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў у падтрымку майскага перавароту і прыходу да ўлады ў Польшчы Ю. Пілсудскага. На адным з такіх мерапрыемстваў у Нясвіжы, дзе прамаўляў старшыня ЧБР А. Паўлюкевіч, прысутнічала каля 700 чалавек [12, арк. 119, 170].

Беларуская кніжная прадукцыя і перыядычны друк у міжваенны перыяд ва ўмовах дастаткова сціплай сферы сродкаў камунікацыі з'яўляліся важным рэсурсам для пашырэння і захавання нацыянальнай ідэнтычнасці. У заходнебеларускіх гарадах, мястэчках ці вёсках акрамя нелегальнай літаратуры можна было сустрэць вельмі шмат беларускіх легальных кніг, брашур і газет. У асноўным яны распаўсюджваліся праз сетку беларускіх кнігарняў, якія існавалі ў розных населеных пунктах Заходняй Беларусі. Так, некалькі беларускіх кнігарняў дзейнічала ў Вільні, сярод якіх вылучаліся кнігарні "Надзея", кнігарня С. Станкевіча і г.д. Таксама беларускія кнігарні, у асноўным у 1920-я гг., функцыянавалі ў Гродна, Вілейцы, Валожыне, Лідзе, Маладзечна, Ашмянах [13]. У канцы 1930-х гг., калі беларускі рух знаходзіўся ў стане глыбокага арганізацыйнага крызісу, а палітыка паланізацыі дасягнула свайго апагею, сувязь мясцовых актывістаў з беларускімі кнігарнямі была фактычна адзіным сродкам легальнага атрымання беларускага друкаванага слова дзеля далейшага распаўсюджвання і захавання кантактаў з цэнтрамі беларускага жыцця. Так, Іван Абрамовіч з вёскі Мілейчыцы Бельскага павета ў 1938 г. пісаў у адну з віленскіх беларускіх кнігарняў: "Да нашага кутка не даходзіць неякае беларускае слова друкованае а гета вельмі жаль, то хоць календары

беларускія няхай завітаюць в наш глухій куток. Так прашу шановну книгарню о прислане 10 (дзесяць) календаров атрывных, а 2 (два) календарі кніжковых.” [14, арк. 113 адв.].

Важным носьбітам нацыянальнай ідэнтычнасці для многіх беларусаў ў міжваены перыяд былі перыядычныя выданні беларускага нацыянальнага руху, якія легальна выдаваліся пераважна ў Вільні. Неабходна заўважыць, што ў канцы 1930-х гг., калі многія беларускія арганізацыі былі зачынены польскімі ўладамі, нацыянальны перыядычны друк, таксама значна абмежаваны ўладамі, у многіх мясцовасцях заставаўся адзіным сродкам захавання беларускай ідэнтычнасці і нават яе пашырэння. Як канстантаваў польскі даследчык С. Віславух, распаўсюджванне беларускай прэсы ў Віленскім і Навагрудскім ваяводствах у канцы 1930-х гг. сведчыла пра “жывучасць” беларускага руху, нават ва ўмовах арганізацыйнага крызісу [15, с. 321].

Моцным фактарам распаўсюджвання і захавання нацыянальнай свядомасці ў Заходняй Беларусі былі мемарыяльныя мерапрыемствы – сходы, канцэрты, выступы ў гонар якой-небудзь вядомай асобы беларускай культуры ці гістарычнай падзеі. Месцам правядзення падобных мерапрыемстваў заўсёды быў горад Вільня як важны цэнтр беларускага нацыянальнага руху ў міжваенны перыяд. У прыватнасці, у Вільні беларусы адзначалі 400-годдзе беларускага кнігадрукавання (1925), 400-годдзе I статута ВКЛ (1929), 500-годдзе з дня смерці вялікага князя Вітаўта (1930), 70-годдзе выдання “Мужыцкай праўды” (1933), угодкі смерці М. Багдановіча (1927), І. Луцкевіча (1929), Ф. Багушэвіча (1930), Цёткі (1936) і інш. Звычайна такія мерапрыемствы адбываліся ў наступным фармаце: вядомыя беларускія грамадска-палітычныя ці культурныя дзеячы зачытвалі рэфераты, моладзь дэкламавала вершы, ладзіліся тэатральныя пастаноўкі ці выступ музычных калектываў [16; 17]. Напрыклад, падчас урачыстасцяў 25-гадовага юбілею літаратурнай творчасці Янкі Купалы, якія адбыліся 27 верасня 1930 г. у залі Віленскай беларускай гімназі, быў прачытаны рэферат А. Луцкевіча аб творчасці пісьменніка, гімназісты прадэкламавалі вершы Купалы, а вучнёўскі хор праспяваў некалькі песняў на вершы паэта [18, арк. 70]. Актыўнымі ўдзельнікамі такіх сходаў былі, у першую чаргу, навучэнцы Віленскай беларускай гімназіі і студэнты-беларусы Віленскага ўніверсітэту; нярэдка, аднак, на мерапрыемствы прыходзілі звычайныя жыхары Вільні, якія цікавіліся беларускім грамадскім жыццём. Так, падчас адзначэння 20-х угодкаў смерці Цёткі на мерапрыемства, арганізаванае БІГіК, прыйшло вельмі шмат простых рабочых з віленскіх асяродкаў [19].

Маладаследаваным аспектам легальнасці беларускага нацыянальнага руху з’яўляецца выкарыстанне структур беларускіх нацыянальна-дэмакратычных і паланафільскіх арганізацый левaрадыкальнымі актывістамі для ажыццяўлення сваёй дзейнасці. Камуністы выкарыстоўвалі мясцовыя гурткі легальных беларускіх арганізацый, каб, у асноўным, пазбегнуць пераследу з боку польскіх уладаў і безперашкодна праводзіць агітацыйную дзейнасць. Так, сакратарыят паланафільскай Часовой беларускай рады, які быў створаны ў в. Казлоўшчына Слонімскага павета 1 лютага 1926 г., фактычна цалкам складаўся з дзеячаў леварадыкальнай накіраванасці. Яго кіраўніком з’яўляўся вядомы ў будучым пісьменнік С. Сіняк (Хмара), які быў блізка звязаны са структурамі КПЗБ [20; арк. 122]. Падобныя сітуацыі, тым не менш, стваралі дастаткова негатыўны вобраз беларускага руху ў вачах польскіх уладаў. У мясцовай паліцыі пасля такіх выпадкаў яшчэ больш падмацоўваўся стэрэатып, што любая праява беларускай актыўнасці, нават без палітычнага кантэксту – гэта праява “бальшавізму” ці антыдзяржаўнай агітацыі. Дадзеная акалічнасць стварала значныя перашкоды для правядзення беларускімі арганізацыямі, напрыклад, культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў.

Такім чынам, у міжваены перыяд у Заходняй Беларусі актывісты беларускага нацыянальнага руху выкарыстоўвалі featureзнабаковыя формы легальнай дзейнасці, якія дазваляліся існуючым польскім заканадаўствам. Дзякуючы правядзенню передвыбарнай агітацыі, распаўсюджванню легальнай літаратуры і перыядычных выданняў, правядзенню мемарыяльных мерапрыемстваў у беларускую дзейнасць рэкрутаваліся новыя прыхільнікі, а сярод розных пакаленняў пашыралася ці замацоўвалася нацыянальная ідэнтычнасць. Разам з гэтым, у 1930-я гг. сфера легальнай дзейнасці беларускага руху значна звужалася польскімі ўладамі з мэтай правядзення актыўнай паланізацыі беларускага насельніцтва. На канец 1930-х гг. легальны беларускі рух у заходнебеларускай правінцыі фактычна захаваўся толькі ў выглядзе распаўсюджвання друкаваных выданняў, што стварала негатыўныя тэндэнцыі для далейшага развіцця нацыянальнай свядомасці.


1. Горны, А. Да пытання аб класіфікацыі беларускіх палітычных арганізацый у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд / А. Горны // Беларускі гістарычны часопіс. – 2019. – № 9. – С. 3–8.
2. Пашкевіч, А. В. Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (1921–1930 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. В. Пашкевіч. – Мінск, 2006. – 162 с.
3. Перад выбарамі // Беларускі звон. – 1922. – № 25. – С. 2.
4. Хроніка // Беларускі звон. – 1922. – № 26. – С. 4.
5. Беларускі дзяржаўны архіў–музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). – Ф. 3, воп. 1, спр. 209.
6. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 662, воп. 3, спр 32.
7. Wybory gminne // Przegląd Wileński. – 1927. – Nr 13. – S. 3–4.

8. ДАГВ. – Ф. 551, воп. 1, спр 1011.
9. ДАГВ. – Ф. 24, воп. 1, спр 24.
10. Беларускія зьезды – вечы // Сын беларуса. – 1924. – № 1. – С. 3.
11. Полуян, В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В. Полуян, И. Полуян. – Минск: Госиздат БССР, 1962. – 224 с.
12. ДАГВ. – Ф. 664, воп. 3, спр. 9.
13. Беларускія кнігарні // Народ. – 1928 – № 18. – С. 4.
14. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). – F. 368, ap. 1. b. 60.
15. Віславух, С. Нацыянальныя адносіны на тэрыторыі ўсходніх ваяводстваў / С. Віславух // Arche. – 2018. – № 1. – С. 69–358.
16. Прысутны. Сьвяткаваньне 400-лецьця Статуту Вялікага Князьства Літоўскага / Прысутны // Наперад. – 1929. – № 1. – С. 4.
17. Акадэмія ў чэсьць Фр. Багушэвіча // Беларуская крыніца. – 1930. – № 32. – С. 4.
18. LCVA. – F. 53, ap. 23, b. 2078.
19. З беларускага жыцьця. Многалюдны вечар // Беларуская крыніца. – 1936. – № 48. – С. 2.
20. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242п, воп. 1, спр. 106.